Источник: "ЛіМ" - 2012-12-21

Пункцірам

✔Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў удзельнікаў III Мінскага міжнароднага Каляднага опернага форуму. У віншаванні выказаная ўпэўненасць, што форум падорыць мноства ўражанняў і цікавых сустрэч, зробіць важкі ўнёсак ва ўмацаванне міжнароднага культурнага супрацоўніцтва.

✔Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў народнага артыста СССР Радзівона Шчадрына з 80-годдзем. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што на беларускай зямлі артыста добра ведаюць і любяць як аднаго з найвялікшых кампазітараў сучаснасці, дзейнасць якога спрыяе развіццю духоўных і культурных сувязей братніх народаў Беларусі і Расіі.

✔Дні культуры Ізраіля ў Беларусі, якія праходзілі з 16 па 19 снежня, з'яўляюцца важнай падзеяй у беларуска-ізраільскім супрацоўніцтве. Гэта адзначыў першы намеснік міністра культуры Беларусі Уладзімір Карачэўскі. Беларускія гледачы азнаёміліся з сучасным мастацтвам гэтай краіны. У мерапрыемствах Дзён культуры ўзяла ўдзел дэлегацыя Ізраіля ў складзе 44 чалавек, у ліку якіх — віцэ-мэры некаторых гарадоў, а таксама супрацоўнікі штаба міністра інфармацыі і дыяспары.

✔У цэнтры вывучэння Беларусі пры Усходнекітайскім педагагічным універсітэце ў Шанхаі адбыўся творчы вечар, прысвечаны 130-годдзю з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа. На імпрэзе гучалі вершы класікаў на беларускай і кітайскай мовах, а таксама былі падведзены вынікі конкурсу перакладаў. Цэнтру вывучэння Беларусі перададзены кнігі беларускіх аўтараў — усяго 120 выданняў.

✔Дні Францыска Скарыны прайшлі ў сталіцы Чэхіі — Празе. Праект прымеркаваны да 495-годдзя з дня выдання вялікім асветнікам першай друкаванай Біблії на старабеларускай мове, а таксама 20-годдзя ўстанаўлення дыпламатычных адносін паміж Беларуссю і Чэхіяй. Адбылося ўскладанне кветак да памятнай дошкі Францыску Скарыне ў Славянскай бібліятэцы ў Клеменцінуме, якая з'яўляецца старэйшай у Еўропе, а таксама да помніка беларускаму асветніку ў пражскім раёне Градчаны.

✔З 2013 года ўсе фільмы Нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм", якія выходзяць у кінапракат краіны, будуць з'яўляцца ў лічбавым фармаце. Пра гэта паведаміў генеральны дырэктар кінастудыі Алег Сільвановіч. Паводле яго, у 2012 годзе кінастудыя "Беларусьфільм" цалкам перайшла на лічбавыя тэхналогіі вытворчасці фільмаў. "Пераход на лічбавы фармат, якому ўласціва вельмі высокае разрозненне, дабаўляе кінакадрам шмат дадатковых падрабязнасцей", — запэўніў Алег Сільвановіч.

✔Франка-беларуская асацыяцыя "Жыццё ў музыцы" (La vie en musique) узнагародзіла прэміямі дзвюх лепшых выпускніц кафедры кампазіцыі Беларускай акадэміі музыкі. Узнагароджанне адбылося падчас святочных мерапрыемстваў, прысвечаных 80-годдзю Беларускай акадэміі музыкі. Прэмія ўручаецца ўжо шосты год запар, гэтым разам ёю ўганараваны Вікторыя Спарыш і Алена Гуціна.

✔Прэзентацыя першых двух тамоў 25-томнага збору твораў Уладзіміра Караткевіча адбылася на філалагічным факультэце БДУ. На сустрэчу запрашаліся складальнікі, рэдактары, даследчыкі творчасці пісьменніка, сярод якіх член-карэспандэнт НАН Беларусі Міхась Мушынскі, доктар філалагічных навук Адам Мальдзіс, Вячаслаў Рагойша, Таццяна Шамякіна. Працу над зборам твораў плануецца завяршыць да 2020 года.

Падрыхтавала
Ярына РЫТАМІНСКАЯ

Ярына Рытамінская. Пункцірам